**ДУК Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці**
**і метадычнай работы**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за жнівень 2025 г.

**1.08.2025г.**

У рамках праекта «От милосердия в книгах – к неравнодушию в жизни» у філіяле «Дзівінская сельская бібліятэка» прайшоў дзень чытацкіх задавальненняў «Талантов россыпь – гениев полёт». Бібліятэкар расказала пра захапленні чалавека, пра гісторыю рукадзелля. Валянціна Гапановіч пазнаёміла з выставай творчых работ работнікаў Дома рамёстваў. Прысутным прадстаўлена кніжная выстава «Женских рук прекрасные творенья».

Філіял «Дзівінская сельская бібліятэка»

**1.08.2025г.**

У філіяле «Гарадзецкая сельская бібліятэка» прайшла квэст-гульня «Путешествие в Африку в поисках клада». Дзеці праходзілі па станцыях: «Следопыт», «Крокодилы в реке», «Болото», «Танец папуасов», «Оседлай кенгуру», «Обезьяны и бананы» на якіх удзельнічалі ў конкурсах, віктарынах, выконвалі заданні і дэманстравалі свае веды аб дзікай прыродзе Афрыкі.

Філіял «Гарадзецкая сельская бібліятэка»

**5.08.2025г.**

У рамках праекта «У гэтым краі я жыву, гэты край я слаўлю» філіяла «Тэвельская сельская бібліятэка» арганізавала для юных чытачоў краязнаўчае падарожжа «Узнаем лучше край родной». дзеці даведаліся шмат новага і цікавага пра свой родны край, усклалі кветкі ля помнікаў загінулым землякам у в. Дзявяткі, в. Глінянкі.

Філіял «Тэвельская сельская бібліятэка»

**8.08.2025г.**

Удзельнікі праекта «От милосердия в книгах – к неравнодушию в жизни», які рэалізуецца ў філіяле «Дзівінская сельская бібліятэка», здзейснілі экскурсію да рэспубліканскага батанічнага помніка «Дуб Сувораўскі». Экскурсію правяла педагог дадатковай адукацыі ДУА «Кобрынскі РЦДТ» Юлія Піваварава.

Філіял «Дзівінская сельская бібліятэка»

**8.08.2025г.**

У філіяле «Акцябрьская сельская бібліятэка» прайшла конкурсна-забаўляльная праграма «Про всё на свете, что любят дети». Дзеці прымалі

актыўны ўдзел у спаборніцтвах і конкурсах дзе яны атрымалі зарад станоўчых эмоцый і весела правялі час.

Філіял «Акцябрьская сельская бібліятэка»

**22.08.2025г.**

У рамках праекта «Библиотека без границ» у чытальнай зале Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы прайшла літаратурна-музычная гасцёўня «100 часов счастья», прымеркаваная да 80-годдзя з дня нараджэння паэткі Ларысы Рубальскай. Прыхільнікі паэзіі Ларысы Рубальскай — падапечныя аддзяленні сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў і дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту Кобрынскага ТЦСАН і пражываючыя Кобрынскага сацыяльнага пансіяната «Нікольскі» пазнаёміліся з яе біяграфіяй, творчасцю і асабістым жыццём, прагледзелі відэаролікі з песнямі выкананымі на вершы Ларысы Рубальскай.

Установа

**28.08.2025г.**

У чытальнай зале Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы сумесна з ДУ «Кобрынскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва» прайшла інтэлектуальная гульня «Что? Где? Когда?». Пераможцы атрымалі пераходзячы Кубак гульні «Что? Где? Когда?» і падарункавыя сертыфікаты на карыстанне камерцыйным фондам Установы і ў піцэрыю «Итальяна».

Установа

Выканаўца
Чопік Д. І.
3 85 81